Саверчанка, І.В. Спадчына Максіма Багдановіча: інтэлектуальнасць і мастацкая вытанчанасць / І.В.Саверчанка // Роднае слова. 2012. № 4. С. 10 – 14.

Іван САВЕРЧАНКА

# Спадчына Максіма Багдановіча: інтэлектуальнасць і мастацкая вытанчанасць

Максім Багдановіч (1891 – 1917) – класік нацыянальнай літаратуры, канцэптуальны пісьменнік, стылёва шматпланавы і эстэтычна шматмерны майстар слова. У яго творчасці арганічна спалучаліся традыцыі еўрапейскай літаратуры, антычнай культуры (рымскай і грэчаскай),  рускай класікі і беларускай народнай творчасці.

Унікальная спадчына М.Багдановіча ўключае – паэзію, прадстаўленую зборнікам "Вянок" (1913) і вершамі розных гадоў, мастацкую прозу, публіцыстыку і літаратурную крытыку. У творчай эвалюцыі М.Багдановіча вылучаюцца тры этапы. Першы, "вянкоўскі" (1907 – 1913 гг.); другі перыяд эстэтызацыі (1914 – 1916 гг.); трэці, апагейны час, калі былі напісаны вершы "Пагоня", "Маладыя гады", "Нябачнае яно", "Беларусь, твой народ дачакаецца канец (1916 – 1917 гг.)

Асэнсаванне феномена творчасці М.Багдановіча пачалося яшчэ пры жыцці майстра слова. Вельмі высока ацанілі яго творчасць С.Палуян, расійскі гісторык А.Пагодзін, крытык і публіцыст А.Луцкевіч. Пазней з'явіліся працы Я.Карскага, М.Піятуховіча, У.Дзяржынскага, А.Вазнясенскага, Дз.Саванавіча, Г.Жалязняка, І.Замоціна [2]. Усебакова творчасць М.Багдановіча даследавалі: М.Грынчык [3], А.Лойка [4] і В.Рагойша [5].

Інтэлектуальнасць М.Багдановіча напоўніцу выявілася і ў яго паэзіі, ідэйныя і тэматычныя абсягі якой надзвычай шырокія. Адна з ключавых ідэй паэзіі М.Багдановіча – *роля мастака і місія мастацтва* ў грамадстве. У вершы "*Песняру*" ён бліскуча адказаў на пытанне аб адказнасці паэта перад чытачом. М.Багдановіч заклікаў майстроў слова да філіграннай працы над паэтычным радком.

М.Багдановіч адным з першых літаратараў паспрабаваў у мастацкай форме асэнсаваць *лёс* беларускага народа. У шэрагу вершаў паэт апяваў велічнае мінулае Беларусі, захапляўся неацэннымі культурнымі і духоўнымі здабыткамі беларускага народа. У вершы "Летапісец" М.Багдановіч перадаў унутраны свет старажытнага кніжніка, які фіксаваў для нашчадкаў важнейшыя падзеі мінулага, распавядаў пра розныя аспекты жыцця грамадства. Узрушаны маналог Летапісца дасягае месіянскага пафасу:

Хай тыя ведаюць, што з’явяцца па нас,
Ўсю праўду пра жыццё ў наш і прошлы час,
Пра войтаў, лаўнікаў, і райцаў, і паспольства,
Што тут чынілася ў даўнія гады,
Што думалі, чаго жадалі мы тады,
За што змагаліся, як баранілі веру, –
Хай зведаюць усе патомкі праз паперу! [1, т. 1, с. 86].

Праз маналог лірычнага героя М.Багдановіч падкрэсліў выключную гістарычную ролю майстроў слова, іх адказнасць перад нашчадкамі і народам.

Пачуцце найвышэйшай асалоды ад знаёмства з старадаўнім кірылічным “Псалтырам”, напісаным дзякам Гапонам у Ваўкавыску, М.Багдановіч выказаў у вершы “Кніга”.

Класічным вершам “Слуцкія ткачыхі” М.Багдановіч ушанаваў шэдэўры старадаўняга ткацкага мастацтва – слуцкія паясы. Мастацкім словам паэт аддае даніну павагі тым слуцкім дзяўчатам, якія вышывалі цудоўныя ўзоры з васількоў, што сталі сімвалам роднага краю.

М.Багдановіч стварыў выдатныя узоры *грамадзянскай* паэзіі. Ганаровае месца сярод шэдэўраў паэта займае несмяротная “Пагоня”. У творы перададзена глыбінная духоўная сутнасць старадаўняга беларускага герба “Пагоня”. Верш услаўляе пракаветны крывіцкі сімвал – “Пагоню”. Ён напоўнены магутнай рыцарскай энергіяй, змагарным духам, ваярскай адвагай і мужнасцю. “Пагоня” – велічны гераічны гімн, які клікае да змагання за Беларусь, за “маці-Краіну”. Паэт заклікае мацаваць нацыянальны дух перад новымі выпрабаваннямі і выклікамі часу.

Паводле М.Багдановіча, невычэрпнай крыніцай жыццёвай і творчай моцы, надзейным падмуркам стваральнай дзейнасці з’яўляецца “радзімая зямля”. Яна абуджае “душы драмаўшай сілы”, наталяе вялікай энергіяй “слабеючыя жылы”.

У творчасці М.Багдановіча прысутнічалі *хрысціянскія* матывы. У Хрысціянстве і помніках хрысціянскай культуры М.Багдановіч вылучаў эстэтычную дамінанту, а не містычны змест. Верш “Касцёл св. Анны ў Вільні” вельмі важны для ўсведамлення базавых мастацка-эстэтычных прынцыпаў паэта. Майстра слова вабіць невымоўная прыгажосць хрысціянскага храма, “чаруючая краса” якога з’яўляецца невычэрпнай крыніцай духоўнага суцяшэння і лекавання “ад цяжкіх дум”.

На думку паэта, *прыгажосць і харaство* – універсальныя з’явы. Яны нараджаюцца нават у самых неспрыяльных умовах і акалічнасцях, нібы чароўныя “чашачкі лілей” сярод балотнай гнілі.

У творчасці М.Багдановіча знайшла мастацкае ўвасабленне фундаментальная філасофская тэма *жыцця і смерці*. У вершах "З енкам дзіцё ты раджаеш…", "Без сіл, уся ў пату, як белы снег, блядна…", "Пасля радзін ты ўсё штодня марнееш…", "Тым вянкі суворай славы…", "Белы крыж, пліта, пад ёй – магіла…" паэт нязменна падкрэслівае таямнічасць нараджэння чалавека, вызначае асаблівую місію жанчыны-маці, як прадаўжальніцы людскога роду.

У творчасці М.Багдановіча адметнае месца належыць тэме *кахання*. Сапраўдная паэтычная жамчужына паэта – верш "Трыялет", у якім мастак некалькімі надзвычай выразнымі радкамі перадаў сум і роспач лірычнага героя, які мусіў пад ціскам нейкіх жыццёвых абставінаў развітацца з каханай:

Мне доўгае расстанне з вамі
Чарней ад Вашых чорных кос.
Чаму ж нядобры час прынёс
Мне доўгае расстанне з Вамі?
Я паблядне ад горкіх слёз
І трыялет пачаў славамі:
Мне доўгае расстанне з вамі
Чарней ад Вашых чорных кос [1, т. 1, с. 255].

Вяршынным дасягненнем паэзіі кахання, сапраўдным гімнам велічнаму пачуццю, з'яўляецца верш М.Багдановіча "Зорка Венера…". У творы, які стаў рамансам, сапраўды гучыць музыка нябёсаў, паяднаная з зямнымі трывогамі і радасцямі закаханых.

М.Багдановіч стварыў выдатныя ўзоры *пейзажнай* лірыкі. Галоўным прадметам мастацкага захаплення паэта сталіся чароўныя беларускія азёры. У вершы "Возера" паэт убачыў падабенства паміж прыгожым возерам і іскрыстым віном:

Ў чарцы цёмнай і глыбокай
Плешча, пеніцца віно;
Хмелем светлым і халодным
Калыхаецца яно.
І хістаецца асока,
І шуміць высокі бор,
А ў душы не замаўкае
Струн вясёлых перабор [1, т. 1, с. 59].

Непаўторная прыгажосць ночы выдатна перададзена ў вершы "Зімовая дарога". Верш "Зімой", у якім намаляваны зімовы вечар, напоўненыневерагоднай энергіяй і бадзёрасцю.

М.Багдановіч выявіў сябе як выдатны майстар *вясновага* пейзажа. Прыклад таму, цудоўны верш "Перад паводкай". Сапраўдны шэдэўр

пейзажнай лірыкі М.Багдановіча – “Маёвая песня”. Ключавы вобраз твора – “сінякрылы матылёк”, які сімвалізуе прыгажосць і чароўную непаўторнасць быцця.

Імкнучыся да аб’ёманага, сінтэзаванага адлюстравання падзей і жыццёвых з’яў, паэт звярнуўся і да буйных *эпічных* жанраў (“Вераніка”, “Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык”, “Максім і Магдалена”, “Страцім-лебедзь”).

Твор М.Багдановіча “Мушка-зелянушка і Камарык – насаты тварык” вызначаны самім творцам, як “вельмі жаласная гісторыя, выкладзеная згодна з праўдай, беларускім вершам”. На старонках “гісторыі” паэт у сімвалічна-алегарычнай форме намаляваў тыповую калізію з народнага быцця. Героі твора – насякомыя, але іх паводзіны і лад жыцця вельмі нагадваюць побыт беларускіх сялян. У аснове “гісторыі” – меладраматычны сюжэт. Камарык захапіўся знешнім выглядам Мушкі-зелянушкі, неўзабаве згулялі раскошнае вяселле, але потым высветлілася, што маладзіца не ўмее нічога рабіць. Расчараваны жыццём Камар, ад безвыходнасці канчае жыццё самагубствам.

Эпічным паводле задумы з’яўляецца верш “Максім і Магдалена”. Паэт распавядае гісторыю трагічнага кахання хлопца Максіма і ваяводскай дачкі Магдалены. Акрутны ваявода прымусам выдае Магдалену замуж за войта, а яе каханага карае смерцю.

У вершаваным творы “Страцім-лебедзь” М.Багдановіч вольна апрацаваў знакаміты біблейны сюжэт пра вялікі патоп і Ноеў каўчэг. Паэт выступіў як наватар, ён стварыў эпічны вобраз велічнага птаха, якога чакаў трагічны лёс. Страцім-лебедзь у творы сімвалізуе свабоду, моц, самастойнасць, дасканаласць і прыгажосць. Ён не паплыў да Ноя і не стаў прасіць аб выратаванні. Горды і моцны птах – гіне. Канцоўка твора – трагічная, напоўненая глыбокім філасофска-алегарычным сэнсам: “Ад усіх цяпер патомкі ёсць, // Ды няма адных – Страцімавых” [1, т. 1, с. 317].

Дамінантная рыса творчага метаду М.Багдановіча – эстэтычны пантэізм, які выявіўся на ўсіх узроўнях вобразнай сістэмы, творчай манеры і стылю выдатнага майстра слова. Палітра мастацкіх *вобразаў, і сімвалаў-архетыпаў* М.Багдановіча надзвычай насычаная і разнастайная.

Найбольш каларытны і запамінальны ў паэтычны творах М.Багдановіча – вобраз *Лесуна*, які сімвалізуе Паганства, старадаўнюю веру продкаў беларусаў. У розных творах паэта Лясун набывае адметныя семантычныя ўвасабленні. У вершы “Лясун” (1909) – ён паўнаўладны гаспадар лесу, якому падпарадкоўваецца кожнае дрэўца ў бару, ад яго волі залежыць кожны рух і калыханне галінак. У вершы “Чуеш гул?..” Лясун паўстае як адзінаўладны валадар лесу. Каб развеяць маркоту, ён пачынае граць велічную сімфонію, а ў адказ – тысячы соснаў, раўняючыся на яго, звіняць, нібы струны:

Чуеш гул? – Гэта сумны маркотны Лясун
Пачынае няголасна граць:
Пад рукамі яго, навяваючы сум,
Быццам тысячы крэпка нацягнутых струн,
Тонкастволыя сосны звіняць [1, т. 1, с. 52].

У вершы “Я спакойна драмлю пад гарой між кустоў…” (1910) Лясун поўны дэманічнай магутнасці, ён гатовы знішчыць, зламаць і скрывавіць кожнага. У маналогу Лесуна выяўляецца яго крыважэрная сутнасць, беспадстаўная помслівасць людзям. Аднак у вершы “Прывітанне, цёмная пушча…” – Лясун ужо паказваецца адзінокім, заняпалым і прыніжаным, пазбаўленым колішняй велічы і ўлады.

У новым вершы “Хрэсьбіны Лесуна” паэт паказвае Лесуна, адухоўленага беларускай прыродай, ахрышчанага яловымі крыжамі “у сіняй нябеснай купелі”, што сведчыла пра поўную перамогу Хрысціянства над паганскімі багамі, традыцыйнымі вераваннямі народа.

Нарэшце, у вершы “Стаяў калісь тут бор стары…” пра Лесуна засталася толькі згадка, яго след – халоднае возера, што схавала ў цёмных глыбінях таямніцы мінулага.

М.Багдановіч стварыў надзвычай каларытны вобраз *Змяінага цара* – міфалагічнай істоты, якая займала важнае месца ў старажытных вераваннях беларусаў. Адметны сімвал, вылучаным М.Багдановічам, – залатая карона на галаве Змяінага цара , якая сведчыла пра яго уладу. У вершы “У цёмным небе – хараводы…” Змяіны цар водзіць незлічоную колькасць паўзуноў па лясах палях і пушчах. Ён знаходзіць паразуменне з людзьмі. Пры сустрэчы з чалавекам уначы Змяіны цар пакідае яму залаты ражок з кароны на расцеленыае палатно.

У іншым вершы, з красамоўнай назвай “Змяіны цар” (1910), калісьці магутны валадар намаляваны ў перадсмяротным стане. Унутранай семантыкай вобраза М.Багдановіч паказвае закат эпохі язычніцтва на Беларусі. Паэт відавочна ўсведамляў непазбежнасць развітання з героямі і валадарамі мінулага, але ён спачувае знясіленаму Змяінаму цару, які, чакаючы скону, прамаўляе развітальнае слова, напоўненае самотай.

Вельмі адметны ў творчасці М.Багдановіча вобраз “*срэбных змеяў*”, якія выступаюць сімваламі таямнічасці, асцярожнасці і сцішанай загадкавасці прыроды. У вершы “Срэбныя змеі” (1911) паэт стварыў вусцішны малюнак змяінага карнавала на начным возеры. Вадзянік – гаспадар возера, выпускае змяіны вывадак з глыбокіх віроў на водную гладзь, дзе яны пад маладзіком выконваюць містычны рытуал.

Вобраз *Вадзяніка* вельмі важны ў паэтычнай сімволіцы М.Багдановіча. У вершы “Вадзянік” гэтая міфалагічная істота – бяздзейная, апатычная і зусім

непрыглядная. Сівавусы і згорблены Вадзянік гадамі адлежваецца ў ціне на дне ракі, твар яго скрозь аблытаны раслінамі:

Сівавусы, згорблены, я залёг між цінай
І гадамі грэюся – сплю на дне ракі.
Твар травой аблутаны, быццам павуцінай,
Засыпаюць грудзі мне жоўтыя пяскі [1, т. 1, с. 55].

М.Багдановіч звяртаўся да вобраза *Русалкі*. Паводле семантыкі верша “Русалка” (1909) – міфічная істота, што жыве ў вадзе, прагне нашкодзіць людзям, завабіць іх у свае цянёты і давесці да згубы.

Як бачна, паэзія М.Багдановіча прадстаўлена вытанчанымі вершаванымі формамі, сярод якіх класічныя – санет, трыялет, рандо, актава, тэрцын, а таксама эпічныя формы (вершаваныя апавяданні).

Паэтычныя творы выдатнага майстра слова насычаны салярнымі вобразамі, сярод якіх – *сонца, месяц, зоркі і сузор’і*. Паэт карыстаецца адметнымі вобразамі беларускай флоры, якія ўзыходзяць да фальклорнай эстэтыкі – *бяроза, таполя, каліна, асака*. У яго вершах шмат архаічных арніталагічных вобразаў-сімвалаў – *зязюля, сава, кажан*.

М.Багдановіч валодаў якім талентам *празаіка*, аб чым сведчыць ужо яго ранні празаічны твор – прытчавая мініяцюра “*Музыка*” [1907], напісаная пад уздзеяннем фальклорнай эстэтыкі. Галоўны герой – Музыка – аддана служыць свайму народу. Яго замілаванае гранне на скрыпачцы абуджае людзей ад сну, вяртае ім чалавечую годнасць, клікае да змагання. Калі Музыка граў, “людзі падымалі апушчаныя галовы і гневам вялікім блішчалі іх вочы” [1, т. 2, с. 6]. Ад пранікнёнага грання, у якое Музыка укладаў усю душу і сэрца, крыўдзіцелі народа трэсліся, нібы ў ліхаманцы, хаваліся, дзе хто мог. Злыя людзі забілі Музыку, завалодалі яго скрыпачкай і самі пачалі граць народу. Але іх гранне нікога не кранала, бо яно было падманным.

Малюючы трагічную сцэну расправы над народным талентам, імкненне ворагаў панаваць над душой беларускага народа, М.Багдановіч аднак не ператвараецца ў песіміста. Ён з верай і аптымізмам глядзіць на будучыню мастацтва, бачыць яго выключную сацыяльную місію ў сцвярджэнні праўды, брацтва і свабоды людзей. Аб гэтым красамоўна сведчыць і канцоўка навелы: “Прайшло шмат гадоў з таго часу. Скрыпка разбілася. Але памяць аб Музыку не згінула з ім разам. І з-памеж таго народу, катораму ён калісь граў, выйдуць дзесяткі новых музыкаў і граннем сваім будуць будзіць людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе” [1, т. 2, с. 7].

Разважанні пра ролю мастака і прызначэнне мастацтва М.Багдановіч паглыбіў у другой прытчавай навеле “*Апокрыф*” (1913), бліскуча стылізаванай пад евангельскі аповед. Дзеянне адбываецца праз сем тысяч год пасля сатварэння свету, калі Хрыстос другі раз прыйшоў на зямлю і хадзіў

разам з святым Пётрам і Юр'ем "па ўсім Забраным Краі і па Занёманшчыне, і па Задзвіншчыне, і па Бярэзінскай зямлі" [1, т. 2, с. 50].

Трывогу народнага Музыкі, які засумняваўся ў карысці ад свайго занятку, у час, калі іншыя людзі дбайна працуюць на зямлі, М.Багдановіч развеяў словамі, укладзенымі ў вусны Сына Божага: "І сказаў яму Хрыстос: не смуціся ў сэрцы сваім. Ці ж не твае песні спяваюць яны цяпер, у час жніва! Таму не схіляй нізка галавы твае, і не хавай аблічча ад вачэй людскіх. Бо няма праўды ў тым, каторы кажа, што ты – лішні на зямлі. Запраўды кажу я табе: надыйдзе яму гадзіна горычы – і чым ён разважыць тугу сваю, апроч песні твае? Як у дзень смутку, таксама ў дзень радасці ён прызавець цябе. І навучаючы яго казаў: пад песні кладуць чалавека ў калыску, і з спевамі ж апушчаюць у магілу яго. Штодзённымі клопатамі поўніцца жыццё людское. Але калі зварухнецца душа чалавека, – толькі песня здолее спатоліць яе. Шануйце ж песні свае. Бо спяваюць навет жабы ў балоце, а ці ж не лепшымі будзеце вы за іх?" [1, т. 2, с. 50 – 51].

Паводле слушнай высновы М.Багдановіча, абяздолены, бедны, зняважаны і прыгнечаны народ не павінен быць адлучаны ад прыгажосці і духоўнага жыцця. На засцярогі Пётры, які зазначаў, што людзям не да песень, калі ім няма чаго есці, пісьменнік адказаў зноў жа вуснамі Хрыста: "Так, жыццё гэтых людзей цяжкое, беднае і прыгнечанае. Чаму ж ты хочаш яшчэ пазбавіць іх красы! Мала дадзена ім – няўжо ж трэба, каб было яшчэ менш?" [1, т. 2, с. 51].

Паводле эстэтычнай канцэпцыі М.Багдановіча, краса – найвялікшы дарунак і галоўны спажытак для душы чалавека. Пісьменнік фармулюе ўласны погляд на жыццё і мастацтва: "Няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсць той спажытак для душы" [1, т. 2, с. 50 – 51]. Як бачна, М.Багдановіч выдатна ўсвядоміў неспатольную прагу чалавек да прыгожага і дасканалага, што адпавядала глыбіннай сутнасці чалавека, яго духоўным памкненням. Побач з неабходнымі для жыцця гаспадарчымі заняткамі, чалавек, паводле слушнай высновы паэта, заўсёды будзе імкнуцца да прыгожага, шукаць духоўнага спажытку: "Бо нашто каласы, калі няма васількоў". Паводле апраўданай засцярогі М.Багдановіча, празмерная меркантыльнасць у жыцці, занядбанне прыгожага, непазбежна прывядзе грамадства да заняпаду і згубы.

Вельмі значнае, кульмінацыйнае для творчай эвалюцыі пісьменніка – "*Апавяданне аб іконніку і залатару, людзях мудрых і красамоўных, кнігалюбцам нейкім дзеля славы Божай ды размнажэння дабра паспалітага выкладзенае*" (1914). Твор стылізаваны пад старажытную гутарку, якую вядуць два героі-антыподы. Яны выказваюць супрацьлеглыя погляды і абгрунтоўваюць уласныя меракаванні разнастайнымі аргументамі. У цэнтры

"Апавядання…" – разгорнутая спрэчка паміж віленскімі месцічамі – іконнікам Раманам Якубовічам і залатаром Антонам Коржам. Дзеянне адбываецца ў слаўнай Вільні – старажытнай сталіцы Беларусі, у эпоху Рэнесансу, недзе ў пачатку XVI ст. Героі сустрэліся "за келіхам мёду" дзеля сяброўскай гутаркі.

Падчас гутаркі іконнік Якубовіч абураецца дзейнасцю італьянскага мастака-гуманіста Сільвестра Розы, які прыехаў у Вялікае Княства Літоўскае і разгарнуў працу па аздабленні храмаў. Іконнік не прымае таго, што італьянец "старыну ў маляванні гэтым рухаючы, а навіны ўводзячы" [1, т. 2, с. 61]. Асабліва яго непакоіць, што той Сільвестр Роза малюе паганскіх багоў і дбае перадусім пра прыгажосці уласных твораў: "Італіец той, аб красе толькі дбаючы, а на збаўленне душы сваёй забыўшыся, паганскіх багоў і шмат чаго іншага малюе" [1, т. 2, с. 61].

Небяспека ад дзейнасці італьянскага майстра-наватара, на думку героя, – у з'яўленні шматлікіх паслядоўнікаў на Беларусі, якія пачалі ствараць партрэты свецкіх асобаў, нават звычайных людзей, маляваць пейзажы і краявіды: "Найгорш жа тое, што іконнікі полацкія звычаю рускага, а ў працы здольныя і дасведчаныя, навіны гэтыя пераймаюць, ды да таго ж і людзей усякіх, нават роду паспалітага, а таксама і рэкі, бары і лугі і шмат чаго іншага малююць, і час і працу сваю праз усё гэтае марне трацячы" [1, т. 2, с. 61].

Уласную пазіцыю М.Багдановіча, яго погляд на мастацтва, выказвае другі герой – залатар Антон Корж, які заклікае апанента пазітыўна ставіцца да новых праяваў у мастацтве: "Не варт рэч якую-небудзь толькі таму ганіць, што яна для нас за навіну прызнацца павінна. Бо ўсё тое, што цяпер навіною завецца, праз час які старыною мае быць, для людзей усіх станаў – звыклай, а ўшанавання і абароны годнай" [1, т. 2, с. 62].

Словамі свайго героя М.Багдановіч фармулюе надзвычай істотны эстэтычны пастулат: вартасць мастацкага твора залежыць не ад прадмета адлюстравання, а ад хараства, якое мастак стварае ўласным талентам і ўмельствам: "Бо не тое, каго майстар малюе, а толькі тое, як ён гэта робіць, толькі здольнасць і ўлежнасць яго могуць малюнку хвалу і каштоўнасць надаваць. Ікону з Острабрамскай маткі боскай, майстрам рупным і добрым памаляваную, за восем або за дзесяць грошаў літоўскіх купляюць, а за тую ж ікону працы вучня няўмелага нічога не даюць. Вось жа вартасць малюнка толькі ад хараства ў выкананні яго залежыць" [1, т.2, с. 62].

Паводле высновы М.Багдановіча, форма ў твора з'яўляецца арганічнай, неад'емнай часткай яго сутнасці, важнейшай праявай мастацкасці. Менавіта таму, на яго думку, краса формы – адзіная мера каштоўнасці мастацкага твора. Пісьменнік недвухсэнсоўна падкрэсліваў: "Прызнаць мы мусім, што

каштоўнасць вырабаў прыгожых адно толькі праз красу іх форм узрастае і толькі красою форм каштоўнасць тую мераць можна” [1, т. 2, с. 63].

Ад вытанчанасці формаў, якіх дасягае майстар, залежаць прыгажосць і мастацкая вартасць твораў. З другога боку, крытэрыем майстэрства з’яўляецца ўменне майстра дасягнуць дасканаласці формы мастацкіх рэчаў: “Бо чым болей ад работы майстра формы рэчы прыгажосці набіраюць, тым каштоўнейшай рэч гэтая пачынае рабіцца. Таксама і здольнасць майстра тым большай трэба ўважыць, чым лепшую форму кавалку срэбра або золата прыдаць ён здольны” [1, т. 2, с. 63].

На ўзроўні формы ў “Апавяданні…” адчуваецца несумненнае ўздзеянне “сказанняў” Ф.Скарыны да выдадзеных ім біблейскіх кніг, з якімі М.Багдановіч несумненна быў добра знаёмы.

М.Багдановіч выявіў сябе як выдатны пісьменнік-пейзажыст. У мініяцюры “*Вясна*” (1914) паэт стварыў цудоўны малюнак аднаўлення прыроды, перадаў непаўторны водар кветак, шум зазелянелай лістоты, птушынае разнагалоссе.

У замалёўцы “*Гарадок*” (1916) М.Багдановіч выдатна перадаў атмасферу сярэднявечнага беларускага горада. Фантазія пісьменніка малюе прыгожыя княжацкія харомы ў цэнтры горада: “Яны дубовыя, выгодныя, зробленыя на два паверхі. Блішчаць іх шыбы з чырвонага, сіняга, жоўтага шкла. Стаўні, дзверы, балясіны аздоблены пекнай разьбой, памалёваны ў вясёлыя фарбы” [1, т. 2, с. 130]. Асноўны акцэнт пісьменнік зрабіў на апісанні рамесніцкіх асяродкаў – Кавальскай вуліцы, слабодкі Ганчароўна і Кажамяцкага завулка. Там жылі майстры, якія выраблялі зброю, адзенне, побытавыя рэчы і посуд, а таксама дзівосныя ўпрыгожанні – “пекныя пярсцёнкі, кольчыкі ў вушы, блішчастыя запоны і гузікі, і не толькі з жалеза ці спіжу, а нават з золата і серабра” [1, т. 2, с. 131].

Надзвычай дасканалая ў мастацкім плане замалёўка М.Багдановіча “*Сярод глухой пушчы…*” [1916]. Каларытнымі мастацкімі фарбамі пісьменнік паказаў, як з’яўляліся новыя паселішчы сярод глухой пушчы. Галоўныя героі твора – Каліна і яго пяцёра сыноў працуюць да стомы, кабператварыць ляда ва ўрадлівую глебу. М.Багдановіч займальна распавёў пра асноўныя заняткі жыхароў вёскі Калінавічы – земляробства, жывёлагадоўлю, рыбалоўства. Сярод абрадаў ён вылучыў “дзяды” – старадаўні звычай беларусаў па ўшанаванні душаў продкаў. З асаблівым захапленнем М.Багдановіч пісаў, як даўнія продкі беларусаў “пакланяліся сонцу, бо ад сонца найбольш залежыла ўся іх гаспадарка, увесь іх быт” [1, т. 2, с. 132].

Як пісьменнік-інтэлектуал М.Багдановіч найбольш поўна выявіўся ў навуковай і мастацкай публіцыстыцы. У глыбокім артыкуле “*Беларусы*” (1915), напісаным на рускай мове, М.Багдановіч прасачыў гістарычны лёс

беларускага народа, акрэсліў асноўныя этапы развіцця нацыянальнай культуры, адзначыў яе ўзлёты і заняпады. У падсумаванні да артыкула ён заклікаў расійскую інтэлігенцыю “працягнуць руку дапамогі беларускай інтэлігенцыі”, якая на той момант прыкладала неверагодныя намаганні дзеля адраджэння народнай культуры.

У праграмнай публікацыі “*Хто мы такія?*” (1915) М.Багдановіч абгрунтаваў неабходнасць культурнага адраджэння Беларусі, выступіў супраць апалячвання і русіфікацыі народа, заклікаў шанаваць родную мову, нацыянальныя каштоўнасці і традыцыі. Пісьменнік ўзрушана прамаўляў: “Агляніцеся: усё наша роднае, беларускае, марнуецца, нішчыцца, знікае, бо яго забіваюць, яго прыглушаюць, ім пагарджаюць, а чужое пануе, пышаецца, мае сабе пашану і павагу. І – хто ведае? – быць можа, пройдзе колькі часу, і не пазнаем мы ані нашага краю, ані нашых дзяцей. І будзе скрозь усё чужое, нязвычайнае, а свайго роднага – нічога. Дык няхай жа не станецца так! Не пакінем свае гаворкі, сваіх песняў, сваіх звычаяў – свайго кроўнага, спрадвечнага, беларускага. Не адракомся, не забудзем, не кінем на глум: будзема шанаваць, бараніць, дзецям сваім запаведаць” [1, т. 3, с. 127].

М.Багдановіч горача даказваў неабходнасць беларускамоўнай адукацыі, патрабаваў адкрыцця менавіта беларускамоўных школ. У артыкуле “*Голас з Беларусі*” (1916) інтэлектуал слушна папярэджваў: “Выдаляючы беларускую мову са школы, мы знішчаем вынікі велізарнай, шматвяковай духоўнай працы цэлага народа, збіваем думку дзіцяці са звыклых псіхалагічных сцяжынак і груба абсякаем яго духоўны свет” [1, т. 3, с. 202].

Як бачна, М.Багдановіч стварыў неацэнныя шэдэўры нацыянальнай паэзіі, прозы і публіцыстыкі. Яго мастацкім творам уласціва высокая ступень эстэтызацыі, арганічны сінтэз рамантызму, рэалізму і сімвалізму.

У творах М.Багдановіча дамінаваў інтэлектуальны пачатак, яны мелі выразную філасофска-публіцыстычную скіраванасць. Героі не выяўляюць актыўных дзеянняў, яны перадусім выказваюць грунтоўныя сентэнцыі, вядуць спрэчкі вакол фундаментальных быційных праблем, – жыцця і смерці, прызначэння і сутнасці мастацтва, шукаюць аб’ектыўныя крытэрыі мастацкасці.

У аснове вобразнай сістэмы выдатнага майстра слова – рэаліі Беларусі, найбольш яркія і знакавыя праявы роднай зямлі. Творам класіка беларускай літаратуры ўласціва моўна-стылёвая адшліфаванасць, незвычайная пачуццёвасць і глыбокі патрыятызмам.

ЛІТАРАТУРА

1.Багдановіч, М. Поўны збор твораў у 3 т. / М. Багдановіч. – Мн.: “Навука і Тэхніка”, 1992 – 1995.

2. Максім Багдановіч: вядомы і невядомы: зб. літаратуразн. і арх. матэрыялаў / Уклад. і камент. Ц.В.Чарнякевіча; прадм і гласарый Ю.В.Пацюпы. Мн.: Літаратура і Мастацтва, 2011. – 392 с.
3.Грынчык М.М. Максім Багдановіч і народная паэзія. Мн., 1963.
4.Лойка А.А. Максім Багдановіч. Мн., 1966.
5.Рагойша В.П. Паэтыка Максіма Танка: Культура вобраза. Характар верша. – Мінск: Выд. БДУ імя У.І. Леніна, 1968. – 228 с.